**SUMMARY**
**Olga Kurtasova**
**THE PECULIARITIES OF ICONOGRAPHIC SCHEME “THE BURNING BUSH” IN VETKA’S SCHOOLE**
Vetka iconoghaphy The Virgin “the Burning Bush” is explored in the article. On the basis of the Vetka icons iconographic analysis the peculiarities of iconographic scheme “The Burning Bush” are defined. It is also revealed to be changed according to the time of icon creating, as well as the iconographic elements and the reasons. The research is based on the materials collected in the result of expedition to Vetka town (Belorussia), and the ones from private collections from Kharkov and Chuguev.
Key words: Vetka’s schoole, The Virgin “the Burning Bush”, iconoghraphy

***Уладзімір Карэлін,***
***Мікалай Мельнікаў***

# ІКАНАГРАФІЯ АНТОНІЯ ПАДУАНСКАГА Ў БЕЛАРУСКІМ САКРАЛЬНЫМ ЖЫВАПІСУ

У доповіді розглянуто ікони св. Антонія, зафіксовані авторами у храмах Білорусі під час наукових експедицій, а також із деяких музейних колекцій. Проведено статистичний і порівняльний аналіз ікон за часом їх створення, поширенням у межах республіки, розглянуто іконографію окремих творів.
*Ключові слова: ікона, св. Антоній, Дитя-Христос, іконографія, атрибути, поширеність.*

Святы Антоній Падуанскі (каля 1195 — 1231) з’яўляецца адным з найбольш шануемых і праслаўляемых святых каталіцкай царквы. Згодна легенды, ён нарадзіўся ў сям’і знатнага партугальскага рыцара Марціна дэ Буйёна[1]. У 15 гадоў стаў манахам ордэна рэгулярных канонікаў (адгалінаванне ордэна аўгусцінцаў), а ў 1220 г. уступіў у ордэн францысканцаў, прыняўшы імя Антоній. Пасля няўдалай спробы стаць місіянерам у Афрыцы, св. Антоній апынуўся ў Італіі, дзе праявіўся яго талент прапаведніка. У 1222 г. ён прыняў сан святара і ў хуткім часе атрымаў блаславенне на пропаведзь ад



самога Францыска Асізскага. Святы выкладаў у францысканскіх школах і займаўся адміністрацыйнай дзейнасцю ў ордэне. Апошнія гады свайго жыцця ён прапаведаваў у Падуі, дзе і скончыў свой жыццёвы шлях. Ад назвы гэтага горада св. Антоній і атрымаў сваё прозвішча — Падуанскі. У1231 г. папа Рыгор IX кананізаваў св. Антонія, а ў 1946 г. папа Пій XII абвясціў яго Настаўнікам Царквы. Шанаванне памяці святога адмячаецца 13 чэрвеня, у дзень яго смерці.

Св. Антоній Падуанскі шырока шануецца ў Беларусі. Яго імя носяць каля дзесяці каталіцкіх храмаў. У большасці касцёлаў знаходзяцца скульптурныя ці жывапісныя выявы святога. Па колькасці прысвечаных яму абразоў св. Антоній уступае толькі Маці Божай і Хрысту. Падчас экспедыцыйных даследаванняў, праведзеных ў 1980-х гг. навуковымі супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) НАН Беларусі, у 95 касцёлах было зафіксавана больш ста абразоў з выявай Антонія Падуанскага. Асноўная іх частка (звыш 70%) знаходзіцца ў Гродзенскай вобл. Можна вылучыць некалькі тыпаў іканаграфічных схем, што сустракаюцца на гэтых абразах.

Найбольш распаўсюджаныя абразы, іканаграфія якіх заснавана на яўленні дзіцяці-Хрыста св. Антонію у яго келлі (ніжэй будуць разгледжаны некалькі абразоў з Гродзенскай вобл.). Так, на абразе з г. Ліда (мал. 1; канец 18 ст., палатно, алей, 163×83) прадстаўлена выява св. Антонія, укленчанага каля століка з раскрытай кнігай. Яго позірк і працягнутыя рукі скіраваны да зыходзячага зверху дзіцяці-Хрыста. Каля ног святога знаходзіцца кветка лілеі. На другім абразе з в. Бераставіца лілея змешчана ў скрыжаваных далонях рук укленчанага Антонія. Ён пазірае ўверх, дзе ў аблоках прадстаўлена паясная выява бласлаўляючага дзіцяці-Хрыста. Над галавой святога змешчаны надпіс: “S Antoine de Padoue”. Іканаграфія абраза з в. Лунна Мастоўскага раёна (мал. 2; канец 18 — пачатак19 ст., палатно, алей, 71 57)





больш нагадвае вядомы твор знакамітага іспанскага мастака Барталоме Эстэбана Мурыльо “Бачанне Св. Антонія з Падуі”. Дзіця-Хрыстос з лілеяй у левай руцэ сыходзіць па раскрытай кнізе да ўкленчанага святога. Над галавой Антонія знаходзіцца анёлак-пуцці, які трымае ў руках карону і вянок з ружаў. На абразе сярэдзіны 19 ст. з в. Радунь Воранаўскага раёна (мал. 3; 1854 г., палатно, алей, 220 126) падзея з’яўлення Хрыста адбываецца не ў келлі святога, згодна паданню, а ў храме перад алтаром з выявай Збавіцеля. Дзіця-Хрыстос, які стаіць на раскрытай кнізе, сваімі ручкамі абдымае ўкленчанага Антонія. У правай ніжняй частцы абраза змешчаны надпіс: “T. Kossitowski Anno 1854”.

У асобную групу можна вылучыць абразы, дзе дзіця-Хрыстос прадстаўлены ў якасці атрыбута св. Антонія: ён сядзіць ці стаіць на кнізе, якую святы трымае ў руцэ. Найбольш адметным з’яўляецца абраз з Шчучынскага раёна Гродзенскай вобл. (мал. 4; 18 ст., палатно, алей, 138×77), які вылучаецца прафесійным пісьмом з тонкай прапрацоўкай дэталяў. Цэнтральную частку кампазіцыі займае роставая выява св. Антонія ў аблачэнні францысканскага







манаха на фоне аблокаў. У правай руцэ ён трымае кветку лілеі, у левай, на чырвоным покрыве, знаходзіцца кніга, на якой сядзіць бласлаўляючы дзіця-Хрыстос. У ніжняй частцы абраза, з абодвух бакоў, паказаны сцэны з жыцця святога. З левага боку прадстаўлены двое францысканскіх манахаў, адзін з якіх (на пярэднім плане) прапаведуе птушкам, а другі — рыбам. Пропаведзь рыбам падаецца ва ўсіх жыціях св. Антонія, а пропаведзь птушкам вядома з аповедаў аб св. Францыску. Таксама двое францысканскіх манахаў прысутнічаюць і ў сцэне з правага боку абраза. Адзін з іх (згодна паданню Антоній) трымае Св. Дары, перад якімі схіліў калені асёл, адвярнуўшыся ад корму, што прапануе яму ерэтык. Падзея адбываецца на гарадской плошчы, на фоне каменнай забудовы. Група гараджан у маляўнічых касцюмах ажыўлена абмяркоўвае гэты цуд. У самым нізе абраза, пад выявай святога знаходзіцца надпіс: “Sanctus Antonius. De Padva.”. У калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь захоўваецца падпісны абраз з падобнай іканаграфіяй, які паходзіць з уніяцкай царквы в. Мірацічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. (мал. 5; 1744 г., дошка, тэмпера, 89×69)[2]. У жывапісным акне, на фоне архітэктурных куліс, змешчана пакаленная выява





святога ў манашаскім аблачэнні. У левай руцэ св. Антоній трымае галінку з кветкамі лілеі, у правай, на чырвоным покрыве, — кнігу, на якой сядзіць блаславўляючы дзіця-Хрыстос з дзяржавай у левай руцэ. У правым ніжнім вуглу знаходзіцца надпіс у выглядзе слупка з пяці радкоў: " "S" ANTO NIVS DEPAD VA". На шырокім полі абраза, па перыметру, змешчаны яшчэ адзін надпіс лацінскімі літарамі на беларускай мове: "PANU BOGU NACHVALE TEN OBRAZ NADAL HRICUK VASIL Z ZONO SVOMA DO CERKVI MIRAT..CKIEI R… ANNO 1744". Яшчэ адзін датаваны абраз (1738 г., палатно, алей, 110×72), які таксама паходзіць з Гродзенскай вобл., захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі. Яго іканаграфія фактычна паўтарае папярэдні абраз, аднак жывапіс выкананы больш прафесійна. Запіс у кнізе КП і фотафіксацыя абраза да рэстаўрацыі сведчаць аб тым, што палатно з выявай святога першапачаткова было замацавана





на дашчатай аснове. Частка надпіса з назвай святога “SV. ANTONIUS ... PADVA” знаходзілася на палатне, а частка з датай — “Anno domini 1738” — на дошцы. Падчас рэстаўрацыі палатно з выявай Антонія і часткай надпіса было змешчана на рэстаўрацыйны падрамнік, а частка надпіса з датай засталася на першаснай аснове і захоўваецца асобна.

Значная частка абразоў з выявай св. Антонія разам з дзіцяці-Хрыстом закрыты металічнымі абкладамі і адрозніваюцца асобнымі элементамі іканаграфіі. Так, на абразе з Ашмянскага раёна Гродзенскай вобл. (мал. 6; канец 18 ст., палатно, алей, 145×80) кніга, на якой сядзіць блаславуляючы дзіця-Хрыстос, знаходзіцца не ў руках Антонія, а ляжыць на пакрытым абрусам століку. Побач з кнігай змешчаны чэрап, на які святы абапіраецца правай рукой; у левай руцэ ён трымае дзяржаву. На фоне абраза з г. Слоніма Гродзенскай вобл. (17 ст., палатно, алей, 180 92) змешчаны шматлікія воты з выявамі жывёл, частак цела і інш. На адной з вотаў змешчана дата — 1782. Дзіця-Хрыстос сядзіць на кнізе, якую трымае Антоній, і сваімі ручкамі абдымае святога за шыю. На абразе з Міёрскага раёна Віцебскай вобл. (мал. 7; 18 ст., палатно, алей) ён гарэзліва казыча Антонія за падбародак. Гэты элемент іканаграфіі сустракаецца яшчэ на адной групе абразоў, адметнай асаблівасцю якіх з’яўляецца тое, што Хрыстос прадстаўлены ў выглядзе немаўля, якога святы трымае на руках, як напрыклад, яшчэ на адным



творы з в. Міёрскага раёна (мал. 8; 18 ст., дошка, тэмпера, 64,0×43,5). Цікавым з гістарычнага боку гледжання з’яўляецца абраз з касцёла ў Лідскам раёне Гродзенскай вобл. (мал. 9; 1930 г., палатно, алей, 130×90), на якім немаўля-Хрыстос абдымае святога за шыю. На абразе змешчаны подпіс аўтара — “Witold Pilecki”, а таксама месца і дата яго стварэння — “Sukurcz 1930”. Захаваліся звесткі пра гераічны і трагічны лёс гэтай асобы[3]. Вітольд Пілецкі, паляк, нарадзіўся ў 1901 г. у Карэліі. Пасля першай сусветнай вайны ён нейкі час навучаўся ў Віленскім універсітэце на факультэце выяўленчага мастацтва, потым стаў уладальнікам маёнтка Sukurcz, што пад Лідай на Гродзеншчыне. Падчас другой сусветнай вайны Вітольд Пілецкі змагаўся з немцамі ў складзе польскага падполля, падначаленага польскаму ўраду ў выгнанні. У 1948 г. асуджаны камуністычнымі ўладамі Народнай Польшчы да смяротнага пакарання, рэабілітаваны ў 1990 г. У касцёле засталіся два творы Вітольда Пілецкага.

У касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі (былым францысканскім) г. Пінска Брэсцкай вобл., у алтары Антонія Падуанскага, знаходзіцца яго аднайменны абраз, а таксама два асобных абразы з выявамі цудаў святога. На адным з іх змешчаны сюжэт пра цуд з аслом, які ўжо разглядаўся вышэй. На другім абразе (мал. 10; 18 ст., палатно, алей, 165×70) ўвасоблены аповед пра сэрца скнары, якое пасля смерці апошняга было знойдзена па ўказанню Антонія ў куфры са скарбам. У ніжняй частцы абраза знаходзіцца надпіс лацінскімі літарамі з выказваннем св. Антонія: “... Gdzie iest skarb twoy, tam i serce twoie ”.

Як вынікае з вышэйсказанага, абразы з выявай Антонія Падуанскага маюць даволі разнастайную іканаграфію. Можна вылучыць некалькі іканаграфічных схем: 1) абразы, на якіх прадстаўлена сцэна непасрэднага яўлення святому дзіцяці-Хрыста; 2) абразы, на якіх дзіця-Хрыстос падаецца ў якасці атрыбута св. Антонія — ці баслаўляючым, на кнізе, ці ў выглядзе

немаўля на руках у Антонія; 3) абразы, на якіх прадстаўлены асобныя моманты жыццевага шляху Антонія Падуанскага. Іканаграфія абразоў кожнай групы ў сваю чаргу мае пашыраныя варыянты, якія адрозніваюцца як асобнымі кампазіцыйнымі элементамі, так і дэкаратыўным аздабленнем.

1 Хунерман Вильгельм. Святой Антоний Падуанский. — Москва: Издательство Францисканцев, 2004.
2 Высоцкая Н.Ф. Жывапіс барока Беларусі. — Мн., 2003.
3 http://pl.wikipedia.org/wiki/Witold_Pilecki.

**S U M M A R Y**

**Vladimir Karelin**
**Nikolaj Melnikov**

**ICONOGRAPHY OF ST. ANTONY OF PADUA IN SACRAL PAINTING OF BELARUS**

In the report icons with images of St. Antony of Padua fixed by authors in temples of Belarus during scientific expeditions are considered. The statistical and comparative analysis of icons on time of their creation, prevalence for republic territories is carried out, considered iconography separate products.

Keywords: icon, St. Antony, iconography.